Асабістае меркаванне

# Сацыяльна небяспечнае становішча:

## спосаб дапамагчы сям'і ці пакаранне, каб утаймаваць упартых?

**Цягам апошніх трох гадоў у сталіцы каля дзвюх тысяч непаўналетніх з 1,5 тысячы сем'яў прызнаюцца дзецьмі, якія пражываюць у сацыяльна небяспечным становішчы (СНС). Дзве трэці з іх на працягу года здымаюць з уліку, бо сітуацыя ў сям'і нармалізуецца. Аднак працягласць тэрміну знаходжання ў СНС не вызначаецца, а законны прадстаўнік дзіцяці сёння не мае права абскардзіць у судзе рашэнне пра сацыяльную небяспечнасць, якая прысвойваецца часам паспешна, калі ў сітуацыі разабраліся недастаткова. Праз такія недарэчнасці Дэкрэт Прэзідэнта № 18, здараецца, успрымаецца не ў якасці дапамогі, а як татальны кантроль і суцэльныя праверкі. Пра аб'ектыўнасць вызначэння ў СНС і магчымасці спрашчэння і ўдасканалення гэтай працэдуры разважае Зінаіда ВАРАБ'ЁВА, загадчык сектара сацыяльна-педагагічнай работы і аховы дзяцінства камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама.**

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

### Дзяцей — вучыць, бацькоў — працаўладкоўваць

Рашэнні аб прызнанні дзяцей такімі, якія апынуліся ў СНС, прымаюцца саветамі па прафілактыцы безнагляднасці і правапарушэнняў ва ўстановах адукацыі або педагагічнымі саветамі.

— Пры гэтым установа адукацыі ставіць дзяцей на ўлік і арганізуе міжведамасную работу па аказанні дапамогі сям'і, далучаючы да гэтага медыкаў, супрацоўнікаў установы сацыяльнай абароны, міліцыю. Усё гэта робіцца педагогамі дадаткова да іх непасрэдных абавязкаў, — гаворыць Зінаіда Вараб'ёва. — Акрамя таго, настаўнікі дапамагаюць бацькам працаўладкавацца, лячыцца ад алкагалізму, наладзіць стасункі ў сям'і. Адным словам, робяць усё, каб не разлучыць малых з бацькам і маці. Аднак выглядаюць усе гэтыя намаганні як грамадскае даручэнне і ўспрымаюцца хутчэй як рэкамендацыі, паколькі ні медыкі, ні міліцыянеры не падпарадкоўваюцца ўстановам адукацыі.

Узаконеныя паўнамоцтвы раздаваць даручэнні дапамагчы нармалізаваць сітуацыю ў сям'і кампетэнтным спецыялістам маюць, прынамсі, камісіі па справах непаўналетніх, якія вырашаюць, калі дзецям патрабуецца абарона дзяржавы.

### Прызнаць нельга абскардзіць

Хоць за 12 гадоў дзеяння дэкрэта работа вядзецца, ужо планава і ў прынцыпе эфектыўна, аднак яна патрабуе неймаверных высілкаў ад педагогаў. І ці ўсё так добра, калі асноўную работу па нармалізацыі адносін у сям'і выконваюць установы адукацыі, спецыяліст Мінгарвыканкама не ўпэўнена.

Установы адукацыі падчас вызначаюць у сям'і СНС, фактычна выкарыстоўваючы гэтую меру як пакаранне ўпартых бацькоў, альбо проста таму, што не разабраліся ў сітуацыі. Напрыклад, дзейнічалі па заяве аднаго з бацькоў ці нават сваякоў.

— Практыка паказвае, што рашэнні, калі сям'я трапіць на ўлік і калі перастане лічыцца сацыяльна небяспечнай, прымаюцца не заўжды аб'ектыўна і залежаць ад канкрэтнай школьнай адміністрацыі і вопытнасці яе спецыялістаў, — настойвае эксперт. — Часам людзі патрабуюць прызнаць сацыяльна небяспечнымі чужыя сем'і. Літаральна днямі заяўніца настойвала, каб дзяцей суседкі зверху паставілі на ўлік СНС. На маё пытанне навошта, яна адказала: «Няхай да іх прыходзяць камісіі і кантралююць». З іншага боку, тым, хто трапіў на ўлік, цяжка аспрэчыць такое рашэнне. Нязгодныя павінны спачатку абскардзіць рашэнне ў дырэктара, а пасля — у начальніка ўпраўлення. Аднак я не ведаю ніводнага выпадку, калі б дырэктар ці загадчык садка адразу, без цяганіны, скаргаў у розныя ўстановы, адмяніў рашэнне пра СНС, прынятае саветам па прафілактыцы школы або педсаветам дашкольнай установы.

### Добрая работа можа быць лепшай

Каб работа з вызначэннем сацыяльнай небяспечнасці была сапраўды эфектыўнай, яе трэба праводзіць на больш высокім узроўні, упэўнена загадчык сектара. У Міністэрства адукацыі ўжо ёсць прапановы міжведамаснай рабочай групы па распрацоўцы праекта пастановы Саўміна, якая рэгулюе парадак і тэрміны абследавання ўмоў жыцця і выхавання дзяцей, парадак выяўлення і прызнання непаўналетніх дзецьмі, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы.

Мяркуецца, што трэба надзяліць гэтай кампетэнцыяй каардынацыйныя саветы па рэалізацыі Дэкрэта № 18. Гэта паспрыяе аб'ектыўнасці прыняцця рашэнняў, павысіць адказнасць суб'ектаў прафілактыкі і, як вынік, — рэзультатыўнасць мерапрыемстваў, што праводзяцца, упэўнена Зінаіда Вараб'ёва:

— Пры гэтым вынік дзейнасці дэкрэта і так досыць добры. Утрая зменшылася колькасць рашэнняў па пазбаўленню бацькоўскіх правоў, зачынена дзесяць інтэрнатных устаноў. Аднак гэта не азначае, што добрую работу нельга зрабіць лепшай. Трэба перадаць паўнамоцтвы прымаць рашэнне аб прызнанні дзяцей такімі, якія апынуліся ў СНС, камісіям па справах непаўналетніх. Тады ўстановы адукацыі перастануць выконваць некалькі не ўласцівыя ім функцыі па арганізацыі ўзаемадзеяння паміж спецыялістамі розных устаноў пры выкананні патрабаванняў дэкрэта.

**Ірына СІДАРОК.**

Зважай!

# РАЗАМ СУПРАЦЬ НАРКАМАНІІ

**У Мінску прайшла чацвёртая міжведамасная каардынацыйная нарада па пытаннях удасканалення ўзаемадзеяння ў сферы процідзеяння незаконнаму абароту наркотыкаў, прафілактыкі і лячэння наркаманіі.**

Як адзначыў **міністр унутраных спраў Ігар ШУНЕВІЧ,** за апошнія некалькі гадоў шэраг дзяржаўных органаў і грамадзянская супольнасць прыкладалі максімум намаганняў для таго, каб стабілізаваць сітуацыю. І сёння можна казаць аб тым, што колькасць нарказлачынстваў і асоб, якія іх учынілі, значна зменшылася. Зменшылася колькасць злачынстваў, учыненых непаўналетнімі. Але наркапагроза ў краіне застаецца надзённай праблемай. Міністэрства ўнутраных спраў на комплекснай, сур'ёзнай аснове ацэньвае ўсе выклікі і пагрозы, звязаныя з гэтай сітуацыяй.

— Што датычыцца дэкрыміналізацыі нарказлачынстваў у якой бы там ні было форме, то на сённяшні дзень гэта рабіць немэтазгодна і нават шкодна, — падкрэсліў Ігар Шуневіч. — І, на нашу думку, змяненняў у крымінальным заканадаўстве не патрабуецца. Сёння трэба весці гаворку аб удасканаленні аператыўна-вышуковай дзейнасці, пытанняў рэабілітацыі, рэсацыялізацыі і прафілактыкі.

Аналіз сітуацыі ў сферы процідзеяння незаконнаму абароту наркотыкаў сведчыць, што абстаноўка працягвае заставацца кантраляванай і досыць стабільнай. Тым не менш праблема не страчвае сваёй актуальнасці. Нягледзячы на наяўныя станоўчыя тэндэнцыі, можна канстатаваць недастатковую выніковасць прафілактыкі наркаманіі і нарказлачыннасці. Формы і метады некаторых мерапрыемстваў страчваюць эфектыўнасць, а часам даюць зваротны эфект, што прыводзіць да высокай ступені латэнтнай наркаманіі. Пра гэта, напрыклад, сведчыць істотная розніца паміж колькасцю афіцыйна зарэгістраваных наркаспажыўцоў і спажыўцоў ін'екцыйных наркотыкаў, якія звярнуліся па дапамогу ў грамадскія арганізацыі.

У сваю чаргу, **міністр аховы здароўя Валерый МАЛАШКА** паведаміў:

— Колькасць наркаспажыўцоў застаецца досыць высокай. На ўліку ў кабінетах у наркалагаў застаецца каля 7,7 тысячы чалавек. Гэта тая праблема для грамадства, якую мы павінны вырашаць. І адна з сітуацый, якую мы будзем разглядаць, гэта тэма латэнтнага захворвання. Маюцца на ўвазе людзі, якія не стаяць на ўліку ў органах унутраных спраў або ў медыцынскіх установах. Мы павінны знайсці механізмы, якія дазволяць нам працаваць з гэтай катэгорыяй.

— Людзей стрымлівае ў звароце па медыцынскую дапамогу дастаткова жорсткае заканадаўства, — заўважыў Валерый Малашка. — З іншага боку, медыкі павінны працаваць з нарказалежнымі не арыентуючыся на сіндром, а бачыць праблемы канкрэтнага чалавека, медыцынскія і сацыяльныя. У гэтай частцы мы сёння актыўна змяняем як наркалагічную службу, так і работу спецыяльных кабінетаў метадонавай тэрапіі, дзе нарказалежным аказваюць дапамогу як урачы, так і сацыяльныя работнікі, псіхолагі і юрысты.

**Для аказання практычнай дапамогі нарказалежным і сузалежным людзям створаны адзіны інфармацыйны рэсурс «POMOGUT.BY».** На ім акумулюецца ўся інфармацыя, неабходная для тых, хто сутыкнуўся з праблемай. Тут размешчаны пералік арганізацый, якія займаюцца лячэннем і рэабілітацыяй нарказалежных, і кантакты ўсіх устаноў, што аказваюць сацыяльную дапамогу і паслугі па працаўладкаванні. Праект створаны па ініцыятыве МУС пры падтрымцы Упраўлення па наркотыках і злачыннасці ААН.

Акрамя таго, у рамках рэалізацыі праекта ў кастрычніку 2018 года на базе Мінскага гарадскога цэнтра сацыяльнага абслугоўвання сям'і і дзяцей афіцыйна пачаў сваю работу кол-цэнтр па аказанні дапамогі нарказалежным і іх сем'ям. **Па нумары + 375 (017) 311-00-00 усе, хто пажадае, кругласутачна і без выхадных, могуць звяртацца да кваліфікаваных спецыялістаў з пытаннямі прафілактыкі і лячэння наркаманіі.**

**Сяргей КУЛАКОЎ.**

# КУРЭННЕ Ў ЛІЧБАХ І ФАКТАХ

## Барацьба са шкоднай звычкай працягнецца — забароненых зон стане больш

**Сёння ў Беларусі курыць каля 29,6 % насельніцтва. Да 2020 года медыкі плануюць знізіць гэту лічбу да 24,5 %. А новыя нарматыўныя дакументы, якія ўжо распрацоўваюцца, забароняць, напрыклад, курыць на дзіцячых пляцоўках і ў салонах аўтамабіля, калі там знаходзяцца дзеці да 14 гадоў.**

Калі яшчэ ў пачатку 2000-х у нашай краіне было больш за 40 % курыльшчыкаў, то зараз іх стала менш. Дасягнуць гэтага ўдалося дзякуючы сукупнасці мер.

— Дваццаць гадоў таму курылі ўсе — Польшча, Еўропа, мы таксама. Гэта не толькі звычка, але і мода, і стыль жыцця. Курэнне віталася, і моладзь актыўна далучалася, — кажа **начальнік адукацыйнага цэнтра РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава Ірына КАСЕНКА.** — Зараз у многіх краінах адбыліся істотныя зрухі, нельга, напрыклад, курыць у цягніках, рэстаранах, для гэтага вылучаны асобныя месцы. Адбыліся змены і ў нас.

Паводле статыстыкі, курыльшчыкаў больш сярод сельскага насельніцтва (54 %), чым сярод гарадскога (43,3 %). Прычым курыць амаль палова ўсяго мужчынскага насельніцтва — 48,4 %, і усяго 12,6 % жанчын. Кожны трэці курыльшчык на працягу апошняга года робіць спробы пазбавіцца ад шкоднай звычкі.

Цяпер вытворчасць, абарот і ўжыванне тытунёвых вырабаў рэгулюе Дэкрэт Прэзідэнта № 28. Але ў хуткім часе ён будзе заменены новым, які праходзіць зараз працэдуру ўзгаднення. Як паведаміла **галоўны спецыяліст аддзела гігіены, эпідэміялогіі і прафілактыкі Міністэрства аховы здароўя Вікторыя СПЯРАНСКАЯ,** там з'явяцца істотныя новаўвядзенні, у прыватнасці, дэкрэт будзе рэгуляваць абарот электронных сістэм курэння і новых тытунёвых вырабаў. Калі зараз дакументам не прадугледжаны ўстановы і месцы, дзе курэнне забаронена цалкам (заўсёды для гэтага вылучаныя адпаведныя месцы), то ў новым дэкрэце яны з'явяцца. Курэнне таксама забароняць на дзіцячых пляцоўках і ў салонах аўтамабіляў, калі там знаходзяцца дзеці да 14 гадоў.

Курэнне павялічвае рызыку захварэць найперш на рак. У прыватнасці, у таго, хто выкурвае больш за пачак цыгарэт у дзень, імавернасць анкалагічных хвароб узрастае ў 10 разоў.

— Я працую ў анкалогіі 40 гадоў, і сёння мы ведаем, наколькі ўзаемазвязана курэнне і рак, — падкрэсліла Ірына Касенка. — Прычым уплывае яно не толькі на лёгкія. Курэнне закранае многія органы і сістэмы — губы і ротавую поласць, дыхальныя шляхі, стрававод, страўнік, падстраўнікавую залозу, печань, ныркі, мачавыводныя шляхі. Усе яны ўцягнуты ў вывядзенне прадуктаў курэння, якія ўсмоктваюцца нават у кроў і могуць выклікаць рак крыві. Як анколаг-гінеколаг па спецыялізацыі, магу сказаць, што курэнне можа выклікаць нават рак шыйкі маткі ў жанчын. Шкодныя прадукты назапашваюцца ў слізістай, яна становіцца больш прыступнай для хваробы.

Пагрозу для арганізма нясе не толькі нікацін, але і прадукты няпоўнага згарання. Падчас курэння чалавек атрымлівае дозы разнастайных шкодных рэчываў, у прыватнасці сінільнай кіслаты, мыш'яку і нават радыеактыўнага палонію.

— Выкурваючы пачак цыгарэт у дзень, чалавек атрымлівае 1/40 смяротнай дозы сінільнай кіслаты. Уявіце, што адбываецца з курыльшчыкам дзень за днём, — звярнула ўвагу спецыяліст.

Ірына Касенка паведаміла, што 10 мільёнам чалавек у свеце штогод упершыню ставіцца дыягназ «рак», 6 мільёнаў з іх памірае. Паводле прагнозаў медыкаў, у 2020 годзе колькасць захварэлых на рак павялічыцца ўдвая — да 20 мільёнаў, з іх больш за палову загіне.

**Алена КРАВЕЦ.**